Даведнік

Мінскае абласное аддзяленне
Саюза пісьменнікаў Беларусі

# КНІГІ ПІСЬМЕННІКАЎ МІНШЧЫНЫ, ВЫДАДЗЕНЫЯ Ў 2025 ГОДЗЕ




**«Граница литературная» №4**
(проза, паэзія, публіцыстыка)
**Укл. Леанід Крыванос**

Адметнасцю Вялікай Айчыннай вайны з'яўляецца ўклад у Вялікую Перамогу воінаў у зялёных фуражках. З першых секунд вайны і да апошняй хвіліны пагранічнікі самаахвярна змагаліся з агрэсарам. І сёння іх неўміручы подзвіг, самаахвярнасць, гатоўнасць і ў мірны час аддаць жыццё за Айчыну хвалюе сэрцы і розумы літаратараў.

У межах культурнага супрацоўніцтва Мінскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі і органаў пагранічнай службы да 80-годдзя Вялікай Перамогі падрыхтаваны гэты літаратурны альманах. У ім толькі невялікая частка твораў, якія праслаўляюць ратную службу пагранічнікаў розных пакаленняў. Таму ў альманаха і сімвалічны дэвіз: “Межы Радзімы – месца бязмежнага гераізму”. Сваімі вершамі, нарысамі, краязнаўчымі даследваннямі пісьменнікі Міншчыны зрабілі ўклад у сучаснае прачытанне гісторыі органаў пагранічнай службы.




**«У іх жыцці была вайна»**
(проза, паэзія, публіцыстыка)
**Укл. Рагнед Малахоўскі**
*ТАА «Навуковы свет»*

У кнізе змешчаны асобныя паэтычныя, празаічныя і публіцыстычныя творы пісьменнікаў Мінскага абласнога аддзялення ГА “Саюз пісьменнікаў Беларусі”, якія з’яўляюцца ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, ці чыё дзяцінства прыйшлося на гады ваеннага ліхалецця. Змест гэтых твораў – своеасаблівая споведзь сведкаў жахаў тога часу, аповед аб высокіх учынках людзей, якія апынуліся ў небяспечных для жыцця абставінах.

Чытач мае магчымасць пранікнуцца літаратурна-мастацкім адлюстраваннем франтавых падзей, болем страты родных і блізкіх, запаветам для нашчадкаў захоўваць памяць аб мінулым, аберагаць мір і спакой беларускага народа, ствараць надзейную будучыню. Кніга выдадзена ў межах культурнага супрацоўніцтва Мінскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі і Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры да 80-годдзя Вялікай Перамогі.

КНІЖНАЯ СЕРЫЯ «БІБЛІЯТЭЧКА
МІНСКАГА АБЛАСНОГА АДДЗЯЛЕННЯ
САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ»




**Паліна ДВАРАНСКАЯ** г. Мінск
**«Ардашынская рэфлексія»** (паэзія)
*Нацыянальная бібліятэка Беларусі*

Аўтар у сваіх вершах увасабляе гісторыю і культуру Радзімы. Яе чулая душа і дапытлівы зрок адчувальна рэагуюць на навакольны свет з яго маляўнічай прыгажосцю, таемнасцю, нечаканасцямі і сюрпрызамі. У выніку з'яўляюцца глыбокія, рамантычныя, часам сентыментальныя вершы. Па-сучаснаму свежа і арыгінальна гучыць тэма кахання. Гэта першая кніга паэтэсы.

КНІЖНАЯ СЕРЫЯ «БІБЛІЯТЭЧКА МІНСКАГА АБЛАСНОГА АДДЗЯЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ»




**Наталля ЖЫЛЕВІЧ** г. Валожын
**«На беразе мараў»** (паэзія)
*Нацыянальная бібліятэка Беларусі*

Аўтар кнігі – чалавек творчы, са светлай душой і добрым сэрцам, неабыякавы да падзей, што адбываюцца навокал. Таму і змест паэтычнага зборніка ўяўляе сабой яркую палітру пачуццяў. У вершаваных радках чытач адчуе шчырыя прызнанні ў любові да родных мясцін, пяшчотныя словы пра маці, трапяткія ўспаміны пра дзяцінства, радасць і сум кахання, роздум над сэнсам жыцця, пра адказнасць за сённяшні дзень і будучае краіны.




**Рагнед МАЛАХОЎСКІ** Мядзельскі р-н
**«Дзе рачулка Нарачанка…»** (паэзія)
*Нацыянальная бібліятэка Беларусі*

У зборнік увайшлі творы, прысвечаныя малой радзіме аўтара – Мядзельшчыне і Нарачанскаму краю. Вершы створаны пад уплывам прыгажосці зямлі, якая для аўтара цесна пераплецена з першымі самастойнымі жыццёвымі крокамі і пачуццём незабыўнага першага кахання.

## КНІЖНАЯ СЕРЫЯ «БІБЛІЯТЭЧКА МІНСКАГА АБЛАСНОГА АДДЗЯЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ»




**Максім ХАЦКЕВІЧ** г. Барысаў
**«Музыка хваляў і ветру»** (проза, паэзія)
*Нацыянальная бібліятэка Беларусі*

Малады аўтар на высокай філасофскай ноце раскрывае і паказвае свае адносіны да навакольнага свету, падзей. Нататкі і лісты – своеасаблівая душэўная споведзь, перажыванні за негатыўныя з'явы нашага жыцця. Чытач абавязкова ўбачыць у ёй штосьці блізкае свайму светапогляду.




**Генадзь АЎЛАСЕНКА** г. Чэрвень
**«Чаму рэчка Уздзянка такую назву мае»** (казкі)
*Выдавецтва «Беларусь»*

У кнізе чытачы знойдуць не зусім звычайныя тапанімічныя казкі. Аўтар, зыходзячы са сваёй уласнай фантазіі, спрабуе адказаць на пытанне, якім чынам той ці іншы населены пункт ці геаграфічны аб’ект нашай краіны атрымаў сваю назву. Мэта выдання – абудзіць цікавасць чытачоў да гістарычнай спадчыны роднага краю.

**Генадзь АЎЛАСЕНКА**
**«Як Вадзянік**
**з людзей жартаваць спрабаваў»** (казкі)
**«Як валошкі назву гораду далі»** (казкі)
*Выдавецкі дом «Звязда»*

У зборніках тапанімічных казак аўтар у цікавай, займальнай форме тлумачыць назвы населеных пунктаў і вадаёмаў розных рэгіёнаў Беларусі, прапануе юнаму чытачу сваё ўласнае меркаванне пра іх паходжанне, апавядае, з чым можа быць звязана ўзнікненне той ці іншай назвы. Чытач мае магчымасць пазнаёміцца з незвычайнымі казачнымі, а таксама сапраўднымі гісторыямі пра таямніцы беларускіх тапонімаў. Кнігі дапамагаюць усур’ёз зацікавіцца гістрыяй роднага краю.






**Геннадий АВЛАСЕНКО**
**«Удивительные приключения**
**маленького Ветерка из Вентилятора»** (сказки)
**«Ветерок и госпожа Зима»** (сказки)
**«Ветерок и Крысиный король»** (сказки)
*Издательство «Беларусь»*

Серия книг о приключениях Ветерка, который жил в старом вентиляторе из детского садика № 5. Когда вентилятор включали, Ветерок вылетал наружу и играл с ребятишками. Во второй книге Ветерок отправился на поиски своего друга Вихрика, которого захватила в плен грозная госпожа Зима, чтобы превратить в злой и холодный северный ветер. И чтобы его спасти пришлось совершить самоотверженный подвиг. А в третьей книге Ветерок, покинув и свой старый Вентилятор, и вообще детский сад, живёт вполне самостоятельно.












**Лёля БАГДАНОВІЧ** г. Асіповічы
**«Зорныя карункі»** (казкі)
**«Зорныя арэлі»** (казкі)
*Выдавецкі дом «Звязда»*

Казкі Л. Багдановіч вучаць юных чытачоў быць добрасумленнымі, шчырымі, уважлівымі, працавітымі, ветлівымі, а таксама цаніць сяброўства, марыць, заўважаць прыгажосць, быць чулымі, пяшчотнымі, сумленнымі, працавітымі, паслухмянымі і ўважлівымі да старэйшых, заўважаць прыгажосць, дапамагаць сябрам, жыць у згодзе з суседзямі, любіць родных і сваю Радзіму. Творы паспрыяюць выхаванню ў дзяцей паважлівых адносін да старэйшых, любові да жывёльнага і расліннага свету, родных мясцін, імкнення рабіць дабро. У кнігах выкарыстаны беларускія прыказкі і прымаўкі.




**Светлана БЫКОВА** г. Заславль
**«Весёлые нотки»** (стихи, загадки детей)
*Издательский дом «Звязда»*

Книга посвящена музыкальной тематике. В первом разделе автор с юмором оживляет ноты, музыкальные знаки, с жителями леса весело поёт бесконечную лесную песенку. Второй раздел книги включает в себя загадки и будет полезен в приобщении маленьких читателей к познанию азов музыкальной грамоты, к знакомству с музыкальными терминами, понятиями, названиями инструментов.




**Тамара БЯРЭЗІНА** г. Маладзечна
**«Янка едзе на кані»** (вершы для дзяцей)
*Выдавецтва «Мастацкая літаратура»*

Кніга – пераможца рэспубліканскага конкурсу «LitUp». Яе складаюць вершы для дзяцей.







**Дмитрий ВИНОГРАДОВ** г. Узда
**«Чудесный подарок»** (сказки)
**«В ночь на Ивана Купалу»** (сказки)
*Национальная библиотека Беларуси*

В сборники вошли сказки, которые развивают воображение ребёнка, учат сопереживать, слушать и познавать, сравнивать и мыслить, знакомят с миром литературы. Произведения погружают читателя в волшебный мир с его удивительными обитателями. Из книг можно узнать о тайнах Лешего, о чём поёт сверчок за печкой, прочитать небылицы дедушки Митрия и многое другое. Книги подходят для совместного чтения и обсуждения в семье.







**Дмитрий ВИНОГРАДОВ**
**«Звёзды и люди»** (публицистика)
**«Одинокая берёза»** (публицистика)
*Издательство А. Вараксина*

Книги повествует о выходцах из Узденщины – земляках автора – наиболее ярко проявивших себя в годы Великой Отечественной войны на полях сражения, в подполье, в рядах партизан. Новые сведения, полученные в последнее время, открытые архивы, большая краеведческая работа позволили широко осветить страницы жизни этих людей.




**Лідзія ГАРДЫНЕЦ** г. Маладзечна
**«Святло зарніц»** (паэзія, проза)
*Друкарня «Перамога»*

У кнігу ўвайшлі вершы, эсэ і апавяданні. Лёс Радзімы, лёсы блізкіх і дарагіх людзей, прыгажосць прыроды роднага краю – галоўныя тэмы твораў. Іх аб’ядноўвае шчырая любоў да зямлі, якая і з’яўляецца асноўнай крыніцай натхнення аўтара.







**Фёдар ГУРЫНОВІЧ** г. Салігорск
**«Азбука жывёл»**
**«Назавіце расліну»** (загадкі)
*Выдавецтва «Беларусь»*

Вершаваныя загадкі для дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту.




**Татьяна ДАШКЕВИЧ** Минский р-н
**«Куда пропал фонарик светлячка»** (сказки)
*Издательство Свято-Елисаветинского монастыря*

Под обложкой – три сказки, три невероятные истории, очень разные и чем-то похожие. А чем могут быть похожи истории светлячка и кузнечика, талантливого гусляра, польстившегося на богатство, и растущего в огороде маленького кустика, который даже не знает, как его зовут? Тем, что, пройдя через испытания и даже приключения, каждый находит свой «фонарик» – свет в собственной душе. Книга станет хорошим подарком детям также благодаря иллюстратору Любови Макаровой, создавшей яркие, добрые образы сказочных героев.




**Борис ДОЛГОТОВИЧ** (1934 – 2025) г. Минск
**«Их именами названы улицы белорусских городов»** (публицистика)
*Издательство «Беларусь»*

Книга посвящена воинам Красной Армии, партизанам и подпольщикам – участникам Великой Отечественной войны, чьими именами названы улицы белорусских городов и поселков. Среди них известные полководцы, генералы, адмиралы и Герои Советского Союза, а также сыновья братских народов, отличившиеся в боях за Беларусь.




**Борис ДОЛГОТОВИЧ**
**«Побратимы Александра Матросова**
**и Николая Гастелло в боях за Беларусь»**
(публицистика)
*Издательство «Беларусь»*

На основе кратких биографий рассказывается о самоотверженности, боевой доблести и беззаветной преданности воинскому долгу разведчиков, пехотинцев, лётчиков, повторивших подвиги А.Матросова и Н Гастелло.




**Ольга ГРОМЫКО** Минский р-н
**«Год крысы»** (фэнтези)
*Издательство «Альпака»*

Кто-то мечтает о власти и славе, кто-то – о богатстве и роскоши, а кто-то о тихом семейном счастье. Судьба человеческая ветвится на тысячи дорог, и только Пресветлая Богиня знает, куда они ведут. Хватит ли юной путнице удачи, чтобы сделать правильный выбор? (Да и есть ли он на самом деле?) Ведь чтобы одни мечты сбылись, другими иногда приходится пожертвовать…




**Ольга ГРОМЫКО**
**«Крысявки 2.0»** (фэнтези)
*Издательство «Альпака»*

А знаете ли вы, что крысы – очень умные животные? Они отлично разбираются в переменах настроения человека и реагируют на разные интонации, а также ярко демонстрируют привязанность или настороженность по отношению к людям. Еще с крысами можно весело играть и даже научить их забавным фокусам! В своей книге Ольга Громыко с юмором рассказывает о крысявках, волей судьбы появившихся в ее жизни. Автор ненавязчиво дает советы по уходу за этими животными. Книга снабжена забавными иллюстрациями, что делает чтение еще увлекательнее.




**Эсмира ИСМАИЛОВА**
г. Минск
**«Любовь по-стамбульски»** (проза)
*Издательство «*Эксмо»

Много тайн, приключений и дивных блюд откроются на страницах этой книги.

И чудодейственные рецепты, с помощью которых можно завоевать сердце любимого мужчины: рецепт аджуки, рецепт базламы с начинкой, которая в устах влюбленного становится слаще пахлавы, кайгана из баклажанов - нежная, как душа у радушной Бурджу из Джихангира, «Яйла чорбасы» для успокоения капризной свекрови, Пекмез, или «Эликсир стамбульской любви» со вкусом позднего винограда, ореховое пишмание для чайной терапии во время стамбульской непогоды, «Зимний суп Бейран» от любой напасти, тыквенный катмер как обязательное условие для предложения руки и сердца, рецепт воздушных пиши к завтраку, рецепт «Хюнкяр бейенди», которым лакомилась императрица Франции в сердце Османской империи, щербет из фиолетового базилика, или «Эликсир любви» по рецепту Зои Порфирородной.




**Віктар КАЖУРА** г. Вілейка

**Дзівы-таямніцы роднага слова** (для навучэнцаў і настаўнікаў)

*Выдавецкі цэнтр «БА Конкурс»*

Багацце нашай мовы, якое называецца Лексікай, – невычэрпная крыніца, адкуль можна браць і браць словы-самацветы і ствараць неверагодныя карціны, замалёўкі, прыгоды. Толькі варта вельмі ашчадна падысці да Слова. У кнізе сабраны невялікія, але цікавыя і пазнавальныя гісторыі-апавяданні з паўсядзённага жыцця, якія дапамогуць зразумець і засвоіць такі раздзел лексікі, як “Амонімы”.




**Віктар КАЖУРА**

**Энцыклапедыя юнага этнографа** (для навучэнцаў і настаўнікаў)

*Выдавецкі цэнтр «БА Конкурс»*

Кніга складаецца з дзвюх частак: “У руплівай гаспадыні шафы поўныя ды скрыні” і “Калі добры гаспадар, у парадку інвентар”. Яна дае магчымасць сённяшняму пакаленню зазірнуць у мінулае, падзівіцца, а часам і пазайздросціць умельству ды таленавітасці нашага народа.




**Віктар КАЖУРА**

**Падказкі да казкі** (для навучэнцаў і настаўнікаў, у суаўтарстве)

*Выдавецкі цэнтр «БА Конкурс»*

З маленства, яшчэ не навучыўшыся самастойна чытаць, мы чуем ад бацькоў незвычайныя казкі-апавяданні. Яны то чарадзейныя, то пра жывёл, то бытавыя. Прагучаўшы ўпершыню ў маленстве, яны потым усё жыццё суправаджаюць нас. “Падказкі да казкі” не расказваюць, а толькі пачынаюць апавяданні. І трэба вельмі сур’ёзна аднесціся, каб успомніць, узнавіць і поўнасцю пераказаць змешчаныя ў кнізе творы. А яшчэ выканаць заданні да іх.




**Віктар КАЖУРА**

**Тыя – ды не тыя: Жукі** (для навучэнцаў і настаўнікаў, у суаўтарстве)

*Выдавецкі цэнтр «БА Конкурс»*

Шмат ёсць і ў жывёльным, і ў раслінным свеце прыкладаў, калі іх насельнікі жывуць пад чужымі “імёнамі”. Чаму так атрымалася? Што яднае і што розніць гэтых “двайнятак”? На прыкладзе маленькіх насякомых – жукоў – аўтары паспрабавалі адказаць на гэтыя пытанні. Кніга змяшчае шмат цікавай і пазнавальнай інфармацыі, багата ілюстравана “партрэтамі персанажаў”




**Алесь КАРЛЮКЕВІЧ** г. Мінск
**«Шубуршун шукае чыстую ваду»** (аповесць-казка)
*Выдавецтва «Мастацкая літаратура»*

У новай аповесці-казцы А. Карлюкевіча чытач сустрэнецца з вандроўнікам па беларускіх і чужаземных рэках і іншых прасторах. А завуць гэтага няўрымслівага падарожніка – Шубуршун. Цяпер ён дапагае новым сябрам у далёкай краіне ачысціць вялікую раку ад пластмасавага смецця.




**Алесь КАРЛЮКЕВИЧ**
**«Живая вода»** (очерки и сказки)
*Издательство «Беларусь»*

Эта книга – удивительное сочетание научных знаний и художественного представления автора. Маленькому читателю будет полезно и интересно узнать о белорусских реках и других водных объектах. А еще лучше – вместе со взрослыми попробовать найти их на карте Беларуси и отправиться в настоящее путешествие!




**Алесь КАРЛЮКЕВІЧ**
**«Сачыненне на галоўную тэму»** (апавяданні, казкі)
*Выдавецкі дом «Звязда»*

Дзяцінства – гэта радасць, гульні, верныя сябры, клапатлівыя бацькі, любімая школа. У новым зборніку апавяданняў і казак аўтар адкрывае сусвет дзяцей, паказвае іх таямніцы, мары.




**Ирина КАРНАУХОВА** Минский р-н
**«Исчезновение Глеба»** (детская проза)
*Издательский дом «Звязда»*

Каждый человек любую происходящую ситуацию рассматривает под определенным углом зрения, связанным с его представлениями, жизненным опытом или начитанностью. Характеристики героев, их психотипы помогают это увидеть в истории исчезновения пятнадцатилетнего парня Глеба. Чья версия из героев этого рассказа оказалась наиболее интересной и правдоподобной? Это и предстоит решить читателю.




**Ирина КАРНАУХОВА**
**«Ох уж эта Стеша»** (сказка)
*Типография «Победа»*

Главная героиня сказки – паучишка Стеша, которую ожидают интересные приключения и встречи в квартире, где она обитает вместе с мамой.




**Сергей КЛИМКОВИЧ** г. Минск
**«Прогулка к облакам»** (проза)
*Издательский дом «Звязда»*

Книга состоит из рассказов, повести, заметок, миниатюр, созданных на протяжении нескольких лет. Произведения посвящены деревне, сельскому быту, тем теплым, милым нашим сердцам деталям, которые могут быть утрачены со временем. В книге содержатся также заметки о природе. Концепция сборника строится на душевности, точном понимании важности самых лучших человеческих качеств, на самых теплых и настоящих чувствах, которых так мало в наш суетливый век.




**Сергей КЛИМКОВИЧ**
**«Золотинка и фея Слякоть»** (детская проза)
*Издательский дом «Звязда»*

Головокружительная волшебная история, в которую попала девочка Василиса по прозвищу Золотинка, никого не оставит равнодушным. Она и не подозревала, что вместе с друзьями вступит в борьбу с противной феей Слякотью, которая похитила Главную Книгу Новогодних Сказок. Золотинка встретится с феем мебели Шкафутто, с книжниками, Ведьмой Пряничного домика и многими интересными героями.

**Сергей КЛИМКОВИЧ**
**«В нашем классе не до скуки»** (детская проза)
**«Приколы на всю катушку»** (детская проза)
**«Ни дня без приколов»** (детская проза)
*Издательство «Литера Гранд»*

Серия книг о весёлых приключениях и забавных происшествиях проказницы Василисы. Уже потому, что многие зовут её Васькой, можно судить о задорном характере девчонки. Василиса никогда не унывает! Никто на свете не умеет так уморительно проказничать и строить козни, как она. И для нее нет ничего невозможного.

Жизнь простых школьников перед вами – как на ладони, со всеми её радостями, проблемами и загадками! В этой книге – целый калейдоскоп уморительных ситуаций, которые заставят посмеяться или… задуматься.










**Дзмітрый КРАСКОЎСКІ** (1954 – 2022) г. Валожын
**«У нябесным бяздонні»** (паэзія)
*Нацыянальная бібліятэка Беларусі*

Зборнік выбраных твораў паэта і музыканта, патрыёта і грамадзяніна Д. Краскоўскага. Шчырыя пранікнёныя радкі патрыятычных, лірычных і гумарыстычных вершаў абавязкова закрануць сэрца чытача.




**Людміла КРУГЛІК** г. Дзяржынск
**«Басаножпа роснай траве»** (паэзія)
*Нацыянальная бібліятэка Беларусі*

Гэта кніга – шчырая лірычная споведзь аўтара, у якой чытач абавязкова знойдзе штосьці блізкае і дарагое для сваёй душы. Тут і філасофскі роздум аб жыцці, і магічнае прыцягненне да малой радзімы, і любоў да бацькоў, прыроды, людзей. Вершы напісаны традыцыйным стылем і напоўнены глыбокім зместам з лёгкімі нотамі самоты і настальгіі.




**Наталия КУЦАЕВА** г. Минск
**«Православие. Большая визуальная энциклопедия»** (публицистика)
*Издательство* **«***АСТ***»**

В книге рассказывается о возникновении Православия и чем оно отличается от других христианских конфессий, представлены основные периоды развития вероучения, названного «правильной верой». Читатель узнает, как рождались догматы веры и какой ценой давалась свобода вероисповедания, кем создавалась славянская азбука и где были возведены первые православные храмы и монастыри. Уникальные репродукции картин, икон и фресок, эксклюзивные фотографии духовных святынь и шедевров церковного зодчества помогут разобраться в основах православной веры и порядке богослужения в храме.




**Наталия КУЦАЕВА**
**«Первая православная энциклопедия»**
(детская публицистика)
*Издательство «АСТ»*

Книга призвана помочь вашему ребёнку приоткрыть дверь в мир православной веры – она расскажет ему о Боге и Церкви, причём сделает это совсем не скучно и очень наглядно. Юный читатель получит ясные и доходчивые ответы на множество волнующих вопросов: Кто такой Бог и почему люди в Него верят, для чего мы ходим в храм, зачем там ставят свечи, кто изображен на иконах, как правильно молиться, кто такие Ангелы и святые, какой самый главный православный праздник. Также рассказано об устройстве храма и правилах богослужения, о Святых Таинствах и православных традициях, о Священном Писании и учении Господа Иисуса Христа.




**Леонид КРИВОНОС** г. Минск
**«Ку-ку, мой мальчик»** (проза)
*Издательство «Беларусь»*

В книгу вошли повести и рассказы, раскрывающие философию поведения «маленького» человека – обывателя в условиях сложных социально-политических трансформаций, происходивших в советском обществе и в постсоветский период. Произведения отличаются исторической правдивостью описываемых событий, интригуют сюжетами, в которых литературные герои порой становятся жертвами обстоятельств и заложниками собственных или чьих-то амбиций.




**Владимир ЛИХОДЕДОВ** г. Вилейка
**«Беларусь единая и непобедимая.
Три войны»** (публицистика, в соавторстве)
*Издательство «Дело (Восток+Запад)»*

Издание, посвященное 80-летию Победы над немецко-фашистскими захватчиками в Великой Отечественной войне, основано на редких фотографиях, документах, печатных изданиях и рукописях из уникальной коллекции автора – лауреата премии «За духовное возрождение», 55 патриотических книжных альбомов и проекта «Бацькаўшчына».




**Рагнед МАЛАХОЎСКІ** Мядзельскі р-н
**«Шлях слязы»** (паэзія)
*Выдавецкі дом «Звязда»*

У вершах Р. Малахоўскага выразна бачны лірычны герой – усвядомлены чалавек, які жыве, кахае, ідзе наперад, пераадольвае цяжкасці і дзеліцца сваімі неацэннымі назіраннямі з чытачом. Захапляе багацце яркіх сакавітых вобразаў, лагічных высноў і дэталяў, якія дапамагаюць глыбей адчуць паэзію. Сутнасць вершаў не ляжыць на паверхні, што робіць іх прачытанне цікавым заняткам. Аўтар гарманічна сумяшчае тэмы кахання і любові да роднага краю, творчасці і філасофскую лірыку. Яскрава выяўленае пачуццё рытму і мелодыкі, гарманічная кампазіцыя зборніка не пакінуць чытача абыякавым да паэтычнага радка.




**Иван МИТРЯЙКИН** Минский р-н
**«Минский дозор»** (фентези)
*Издательство «Мон Литера»*

После 2020 года у Дневного дозора города Минска меняется руководитель. Шефом темных становится легендарный маг Вячеслав (Вячко) и ему на помощь направляют мага первого уровня Юрия, специалиста по решению самых нестандартных вопросов. Юрий думает, что наконец-то отдохнёт от всех дел в спокойной и красивой Беларуси, но нет. После его приезда в городе происходит ряд странных убийств, погибают иные, но при этом их убивают странными, уже давно не используемыми заклинаниями. Клан оборотней налаживает инициацию и подготовку наемников, а на офисы дозоров происходит дерзкое нападение непонятных существ.




**Оксана МИТРОЩЕНКОВА** г. Воложин
**«Аэрида»** (фэнтези)
*Национальная библиотека Беларуси*

В мире, в котором граница между реальностью и волшебством тонка, девочка “Аэрида” внезапно оказывается в загадочном царстве, полном чудес и тайн. Это история о дружбе и отваге, где магия живёт даже в дыхании ветра.




**Николай СМИРНОВ** г. Минск
**«Цена предательства»** (публицистика)
*Издательство «Беларусь»*

Бурным героическим и трагическим событиям первой половины XX века на земле Беларуси, некоторым этапам становления белорусской государственности, битвам советской разведки и контрразведки на невидимых фронтах и «цене» предательства посвящена эта книга, предназначенная для широкого круга читателей.




**Анна ОЛЬХОВСКАЯ** Минский р-н
**«Пустота в глазах смотрящего»** (детектив)
*Издательский дом «Звязда»*

Во время прогулки с собакой пожилой соседки Лидии Васильевны Яна находит в парке изуродованный труп молодой девушки. Ктото усадил тело бедняжки в кабинку колеса обозрения, старательно расположив рядом ведерко попкорна, карамельку чупа-чупс, колу в картонном стаканчике... Вскоре Яна узнала, что подобное происшествие далеко не первое, и всегда рядом с телом жертвы находили попкорн, чупа-чупс и колу. По мнению полиции, в городе орудует жестокий маньяк, которого за его любовь к аттракционам прозвали Карусельщиком. Яна хочет забыть о том, что увидела в парке, но оказалось, что у Карусельщика на нее совсем другие планы...




**Анна ОЛЬХОВСКАЯ**
**«Тайна Змеева леса»** (детектив)
*Издательский дом «Звязда»*

Варвара с братом Олегом решили осуществить мечту их родителей – построить собственный дом в тихой деревеньке. И подходящее место нашлось. Вот только по деревне ходят странные слухи: якобы в пещерах, возле Змеева леса, испокон века жил самый настоящий Змей Горыныч, похищавший молодых девушек. А теперь объявился его сын, и девушки снова стали пропадать… Исчезла и Варина знакомая, Карина, в последний раз ее видели на закрытом светском мероприятии. Казалось бы, какая связь между глухой деревней и элитным коттеджным поселком, где проходила вечеринка?




**Елена ПОДКАТИК** г. Борисов
**«Любить нельзя забыть»** (проза)
*Издательский дом «Звязда»*

Главная героиня повести Аня Покатова живет обычной жизнью подростка, не подозревая, что в скором будущем ей придется ежедневно делать выбор – в своем сердце, в своих делах и поступках. И от ее выбора будет зависеть, где поставить такую важную запятую в словосочетании «любить нельзя забыть». Повесть будет интересна не только молодым людям, но и их родителям – у многих из них до сих пор хранятся в шкатулках такие необычные сегодня свидетельства первой любви – бумажные письма в пожелтевших конвертах, хранящие память об их беззаботной юности.




**Марина ПОМОЗ-ЛАЙКОВА** г. Борисов
**«Фотоаппарат»** (детская фантастика)
*Издательский дом «Звязда»*

Даже самый обычный фотоаппарат улавливает миры, отражающие эмоции и мысли человека. Он может стать своего рода порталом между ними... Что заставит примириться давних недругов, отличника Витю Дроздова с насмешницами Иркой и Инкой? Смогут ли вернуться в мир позитива ребята, заблудившиеся в негативе? В этой истории с захватывающим сюжетом утверждаются ценности дружбы, взаимной ответственности, прощения и самоотверженности.




**Зиновий ПРИГОДИЧ** г. Минск
**«Созидатели. Книга 4»** (публицистика)
*Издательство «Беларусь»*

Кніга сабрала пад адной вокладкай гутаркі-эсэ, гутаркі-партрэты, гутаркі-нарысы з народным пісьменнікам Беларусі Янкам Брылём, вядомым паэтам і празаікам Максімам Лужаніным, пісьменнікам-франтавіком Алесем Савіцкім, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь пісьменнікам Барысам Сачанкам, ваенным лётчыкам, генерал-маёрам авіяцыі, пісьменнікам Анатолем Сульянавым, народным паэтам Беларусі Максімам Танкам, народным артыстам СССР Расціславам Янкоўскім.




**Віктар САБАЛЕЎСКІ** г. Узда
**«Словам, фарбай, натхненнем»** (паэзія)
*Друкарня «Перамога»*

У кнізе змешчаны вершы, напісаныя аўтарам пад уражаннем ад карцін мастакоў Уздзеншчыны і майстроў пэндзля з розных куткоў Беларусі, у якіх адлюстравана прыгажосць прынёманскага краю.




**Григорий СОЛОНЕЦ** г. Минск
**«Любовь цвета хаки»** (проза)
*Издательство «Четыре четверти»*

Два разных пути, одна война, навсегда изменившая судьбы тех, кто через неё прошел. Один выбор, после которого возврата нет. 1980-е годы, Афганистан. Военный журналист лейтенант Алексей Разумков и недавняя выпускница техникума связи Любовь Синицына встречаются в чужом краю, где даже небо кажется иным. Между ними вспыхивает чувство – чистое, как горный воздух, и опасное, как минное поле. Но дома Алексея ждут жена и дочь, которых он любит. Что окажется сильнее: долг перед семьей или страсть, рожденная под свист пуль?




**Алена СТЭЛЬМАХ** Мінскі р-н
**«Падарожжа мандарынкі Шушы»** (казка)
*Выдавецкі дом «Звязда»*

Гэта казачная гісторыя незвычайная тым, што дзве яе часткі напісаны на дзвюх мовах: аднана беларускай, другая – на рускай. Часткі кнігі ўзаемазвязаныя, і ў той жа час кожная з іх – самастойная, акунае ў свет аднаго з самых любімых на Зямлі фруктаў – мандарына. Спачатку цуды адбываюцца з мандарынавай костачкай на яе радзіме. А затым мандарынкі адпраўляюцца ў падарожка ў іншую краіну. Ім трэба спяшацца, бо яны – духмяны сімвал Новага года. Гэта кніга – пра любоў да сваёй зямлі, пра ўменне рабіць добрыя справы, пра важнасць агульначалавечых каштоўнасцей.




**Кацярына ХАДАСЕВІЧ-ЛІСАВАЯ** Мінскі р-н
**«Падабайка – гэта я»** (дзіцячая фантастыка)
*Выдавецтва «Беларусь»*

Вы хацелі б мець унікальны гаджэт, які не патрабуе зарадкі, не расходуе трафік, не псуе зрок і не «глючыць»? А яшчэ пашырае веды, вядзе ў свет фантазіі, дапамагае знайсці сяброў у Сеціве, дае магчымасць пагуляць у настольную гульню і вясёлую вандрульню з прызам для самых уважлівых карыстальнікаў сацыяльных сетак? Гэты гаджэт у вас у руках – гэта кніга, у якой Кніжная Фея спалучыла экран смартфона і папяровыя старонкі! У ёй вы пазнаёміцеся з сімпатычным віртуальным героем – Падабайкам, якога ведае ўвесь свет…




**Кацярына ХАДАСЕВІЧ-ЛІСАВАЯ**
**«У пошуках страчанага скарбу»** (фэнтазі)
*Выдавецтва «Беларусь»*

Кніга-квэст запрашае ў цікавае падарожжа. Напачатку гісторыі кожны чытач выбірае сабе аватара, атрымлівае ў кампанію яшчэ аднаго спадарожніка, і яны разам адпраўляюцца збіраць артэфакты ў персанажаў, якія жывуць у таямнічым каралеўстве. Няпросты шлях, якім давядзецца ісці, будзе ў кожнага свой, бо кніга чытаецца не па парадку, а так, як вырашае чытач-герой.




**Кацярына ХАДАСЕВІЧ-ЛІСАВАЯ**
**«Ключ ад Вялікай Каштоўнасці»** (фэнтазі)
*Выдавецкі дом «Звязда»*

У кнізе жывуць міфалагічныя персанажы, знаёмыя нам з фальклору. Кажуць, некалі даўно яны існавалі, і нашы продкі часам бачылі іх на свае вочы. Старонкі гэтага выдання не толькі пакажуць міфічных істот, але і адкрыюць іх таямніцы. Твор уваходзіць у вучэбную праграму па беларускай літаратуры для 6 класа.




**Кацярына ХАДАСЕВІЧ-ЛІСАВАЯ**
**«Год прыгод лісачкі Красуні»** (фэнтазі)
*Выдавецтва «Беларусь»*

Абаяльная і вясёлая лісачка Красуня заўсёды ў цэнтры падзей. Прыгоды знаходзяць няўрымслівую фантазёрку ці яна іх – невядома, але сумаваць лісачцы і яе сябрам ніколі не даводзіцца. У Дзівосным лесе адбываюцца цікавыя, неверагодныя здарэнні і нават страшныя гісторыі… Герояў чакае карагод прыгод ва ўсе поры года.




**Кацярына ХАДАСЕВІЧ-ЛІСАВАЯ**
**«Вухуцік. Міжпланетны ваяж»** (фэнтазі)
*Выдавецкі дом «Звязда»*

Адпраўляйцеся ў міжпланетнае падарожжа, сябры! Вас чакае цудоўная касмічная вандроўка і фантастычна-прыгодніцкая гісторыя пра дзяўчынку з Зямлі і іншапланетніка з таямнічай Вухуціі. Вы здзейсніце палёт на далёкую планету! Якая яна? Хто там жыве? Што адбываецца? Цікавае ці небяспечнае падарожжа атрымаецца ў галоўнай гераіні ічытачоў кнігі, якія разам тэлепартуюцца на загадкавую планету?




**Кацярына ХАДАСЕВІЧ-ЛІСАВАЯ**
**«Сакрэты аднаго каралеўства»** (казка)
*Выдавецтва «Беларусь»*

Персанажы кнігі – не людзі, не жывёлы, не расліны... Гэта казачная гісторыя пра загадкавых істот, якія фарсяць у вытанчаных капелюшах, жывуць у сваім асобным каралеўстве і вірують у эпіцэнтры прыдворных падзей. Хто ж гэты высакародны, арыстакратычны, шляхетны народ? Завітайце ў таямнічае каралеўства, пазнаёмцеся з яго жыхарамі і даведвайцеся, якія падзеі не на жарт узрушылі іх...




**Кацярына ХАДАСЕВІЧ-ЛІСАВАЯ**
**«Код геніяльнасці»** (проза)
*Выдавецтва «Беларусь»*

Кніга адрасавана падлеткам і моладзі. Чытачы пазнаёмяцца з новымі героямі, сваімі аднагодкамі, якія, на першы погляд, нічым адметным не вылучаюцца. Такіх дзяўчат і юнакоў вакол шмат, але старонкі твора распавядуць пра іх жыццёвыя перыпетыі – каханне і здраду, сяброўства і суперніцтва, дабрыню і жорсткасць. Захапляльнасці сюжэту надаюць містычныя падзеі, якія адбываюцца з героямі…




**Кацярына ХАДАСЕВІЧ-ЛІСАВАЯ**
**«Страшныя гісторыі для самых смелых»**
(фэнтазі)
*Выдавецкі дом «Звязда»*

Між старонак гэтай стаіліся таямнічыя персанажы, якія любяць сустракацца з чытачамі познім вечарам, калі самыя смелыя з іх адважваюцца пачытаць страшныя гісторыі пра прывід з хутара, Ліловага цмока альбо Змрочнага птаха. Містычныя персанажы запрашаюць у небяспечны шлях па чырвоных стрэлках, прымушаюць наведаць прыстанак зданяў, прапануюць пазнаёміцца з гасцямі з іншасвету.




**Екатерина ХАДАСЕВИЧ-ЛИСОВАЯ**
**«Добрый почтальон»** (детская проза)
*Издательство «Благовест»*

Главными героями книги являются мальчики Вова и Коля. Первый – сын священника, у него все благополучно, а второй переживает сложный этап в жизни. Ребята подружились не сразу, поначалу Коля не очень радушно принимает нового одноклассника, подначивает его. Но потом целая череда опасных и удивительных событий все меняет. Мальчикам предстоит вместе преодолеть трудности. Коля многое познает, многому учится.




**Екатерина ХАДАСЕВИЧ-ЛИСОВАЯ**
**«Самое счастливое Рождество»** (детская проза)
*Издательство «Благовест»*

Книга посвящена великому христианскому празднику – Рождеству Христову. С её страниц дети узнают о том, какие чудеса происходят с обычными людьми, которые стараются с верой и добром встретить этот день. Рассказы о Боге, наполненные яркими иллюстрациями, помогут детям приобщиться к православной вере. Встречая христианский праздник Рождества, дети смогут увидеть, как вера и добро способны изменить жизнь.




**Елена ХОРОШЕВИЧ** г Минск
**«Минск помнит»** (публицистика)
*Издательство «Беларусь»*

Книга является систематизированным изданием, в котором собраны материалы о памятных местах, в котором собраны материалы о памятных местах, связанных с событиями Великой Отечественной войны, которые расположены на территории Минска. Это мемориалы, обелиски, стелы, воинские захоронения, памятные знаки, мемориальные доски, монументы воинской славы и улицы, названные в честь героев Великой Отечественной войны.




**Таццяна ЦВІРКО** г. Клецк
**«Не спазніся»** (проза)
*Нацыянальная бібліятэка Беларусі*

Зборнік пранікнёных эсэ і кароткіх апавяданняў, напісаных у духу сучаснай рэальнасці. Аўтар прапануе зірнуць на жыццё вачыма герояў, чые звычкі і паводзіны вельмі блізкія кожнаму з нас. Праз прызму паўсядзённых сітуацый і асабістых перажыванняў чытач акунецца ў свет, поўны знаёмых эмоцый і абставін. У творах закранаюцца вострыя сацыяльныя тэмы, тэмы кахання, дружбы, адзіноты, веры, сямейных каштоўнасцей. Кніга падыдзе тым, хто любіць творы, здольныя закрануць пачуцці і думкі, зрабіць паўзу ў паўсядзённай мітусні і паразважаць над сэнсам таго, што адбываецца вакол.




**Валентина ШЫТЫКО** г. Узда
**«Все мы родом из детства»,** (детская проза)
*Печатный дом «Вишнёвка»*

Книга написана на основе детских воспоминаний автора.

Кнігі пісьменнікаў Мінշчыны, выдадзеныя ў 2025 годзе : [даведнік] / Мін. абл. аддз-не Саюза пісьменнікаў Беларусі; склад. Р.Ю. Малахоўскі. – Мінск : 2026. – [67] с.: кал. іл.

## 19 СНЕЖНЯ 2025 ГОДА МІНСКАМУ АБЛАСНОМУ АДДЗЯЛЕННЮ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ СПОЎНІЛАСЯ 20 ГАДОЎ

Мінскае абласное аддзяленне
ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі
Адрас: 220030, г. Мінск, пл. Свабоды, д. 13, каб. 1, 2
Тэлефон: +375 17 347-08-60
E-mail: maaspb.m@yandex.by
Сайт: www.maaspb.by